# У Новы год — экспрэсам





На выхадныя на Дзіцячай чыгунцы ў Мінску пачаў курсіраваць «Навагодні экспрэс». Маленькіх пасажыраў — а іх цягнік можа перавезці больш за 250 чалавек — чакаюць цікавае падарожжа і, вядома, сустрэча з галоўнымі святочнымі героямі. А кіраваць цеплавозам на першым рэйсе казачнага экспрэса даверылі дзесяцікласніку 190-й мінскай школы Святаславу СУНЮ. З абавязкамі машыніста ён спраўляецца як сапраўдны прафесіянал. Хлопец ужо чацвёрты год займаецца ў гуртку «Юны чыгуначнік» і па выніках тэстаў і экзамену паказаў выдатныя веды і ўменні.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**